ЗВЯЗДА 29 мая 2019 г.



# СЯМ'Я, ЗДАРОЎЕ, РАЗ

## і іншыя кірункі дзейнасці гарадской арганізацыі Белару

**Гарадская арганізацыя грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» — адна з самых уплывовых грамадскіх структур у Пінску. У 114 пярвічных арганізацыях налічваецца крыху больш за 3160 жанчын. Старшынёй гарадской арганізацыі абрана Валянціна КУЛАК, якая працуе начальнікам аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі гарвыканкама. Пяць членаў арганізацыі з'яўляюцца дэпутатамі ўсіх узроўняў. Ёсць прадстаўніцы названай жаночай структуры ў Савеце Рэспублікі, у абласным Савеце, чатыры працуюць у гарадскім Савеце дэпутатаў. Дарэчы, і сама старшыня другое скліканне запар абіраецца ў гарадскі Савет.**

Расказваючы пра сваю арганізацыю, Валянціна Мікалаеўна згадвае даўнюю трывалую традыцыю Саюза жанчын — ушаноўваць чалавека працы. Бо абсалютная большасць прадстаўніц Саюза — гэта працаўніцы самых розных галін народнай гаспадаркі. Таму і сёлета на 1 мая жанчыны наладзілі акцыю «Славім жанчыну працы» і адзначылі многіх сябровак, якія дабіліся значных поспехаў на сваіх рабочых месцах — каля сотні жанчын у самых розных намінацыях.

Але ж найбольшы ўпор у рабоце грамадскае аб'яднанне робіць на сям'ю, каб садзейнічаць яе ўмацаванню, прызнанню грамадскай значнасці мацярынства, эфектыўнага бацькоўства, абароне правоў дзіцяці. Ужо некалькі гадоў пінскія жанчыны ажыццяўляюць праект пад агульнай назвай «Вянец усіх каштоўнасцяў — сям'я». Цяпер напярэдадні Міжнароднага дня сям'і, 14 мая, наладзілі сапраўднае гарадское свята. Ушанавалі найперш юбіляраў, тых, хто годна пражыў у шлюбе 10, 20, 30, 50 гадоў. Адзначылі і маладых бацькоў, якія толькі зарэгістравалі нованароджаных сына альбо дачку. Свята адбылося на пляцоўцы шыкоўнага палаца Бутрымовіча, дзе цяпер размяшчаецца гарадскі загс. Яно атрымалася па-сямейнаму цёплым і кранальным, бо сабралася шмат родных, блізкіх, сяброў віноўнікаў урачыстасці. А прыгожыя інтэр'еры палаца надалі пышнасці і паспрыялі запамінальнасці свята.

Ну і, вядома, у Дзень маці арганізацыя Саюза жанчын адзначае шматдзетных матуль. Летась цырымонія праходзіла ў Палескім драматычным тэатры, годам раней — у гарадской канцэртнай зале.

— Вядома, ушаноўваць жанчыну-маці, якая прысвяціла сябе служэнню дзецям, пачэсная справа, і мы будзем яе працягваць, — гаворыць Валянціна Кулак. — Але аднойчы са сваім актывам мы прыйшлі да высновы, што трэба падтрымліваць і папулярызаваць бацькоўства. Бо ў сапраўднай сям'і побач з мамай заўсёды знаходзіцца тата, які дзеліць з жонкай усе клопаты па выхаванні дзяцей. І наша арганізацыя ўпершыню выступіла ініцыятарам правядзення гарадскога конкурсу «Супертата». Спадзяёмся, што акцыя набудзе папулярнасць і ў наступныя гады стане добрай традыцыяй, як, напрыклад, стаў парад калясак напярэдадні Дня абароны дзяцей.

Яшчэ старшыня арганізацыі звярнула ўвагу, што яе актыў стараецца задзейнічаць у мерапрыемствах і развіваць актыўнасць жанчын усіх узростаў. Нават назвы праектаў кажуць самі за сябе: «Маленькая прынцэса», «Прыгажуня Палесся», «Аўталэдзі-Пінск», «Нявеста на веласіпедзе». Апошняя стала асабліва папулярнай у пінчукоў.

Актыўна займаюцца пінскія жанчыны дабрачыннасцю. Штогод напярэдадні 1 верасня праходзіць акцыя рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Збяром партфель разам». Тады і пінскім першакласнікам са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў уручаюць партфелі, якія сабралі клапатлівыя жанчыны. Ёсць у горадзе над Пінай і свае дабрачынныя праекты. Напрыклад, пярвічка дзіцячага садка № 19 актыўна працуе з дзецьмі-інвалідамі. Супрацоўнікі дашкольнай установы ходзяць да хворых дзяцей, займаюцца з імі, падтрымліваюць іх бацькоў.

Многае робіцца гарадской арганізацыяй для яе членаў у плане ўмацавання здароўя. Гэта сёння пытанне нумар адзін для кожнага чалавека. І падштурхнуць яго на пераход да здаровага ладу жыцця, да заняткаў фізкультурай, прымусіць звярнуць крышачку больш увагі на ўласнае здароўе бывае вельмі своечасова. Для гэтага ў арганізацыі ладзіліся сустрэчы з рознымі ўрачамі-спецыялістамі, а таксама з касметолагам, стылістам, візажыстам. Калі ў жанчыны паляпшаюцца настрой і самаацэнка, яна здольная на дасягненне поспехаў і настроеная на работу па ўдасканаленні сваёй асобы. Менавіта на развіццё жанчын накіраваныя мерапрыемствы па арганізацыі вольнага часу. Пастаянна ладзяцца наведванні славутасцяў, такіх як музей Беларускага Палесся, музей Якуба Коласа ў Пінкавічах. Часам за

# ...ВІЦЦЁ АСОБЫ

## ...рускага саюза жанчын

работай, сямейнымі клопатамі жанчыны забываюць пра ўласную культурную праграму, і ім трэба напамінаць — лічаць у гарадской арганізацыі Саюза жанчын. Таму нярэдка купляюць білеты на спектакль свайго тэатра альбо сваіх творчых калектываў для членаў пярвічак. Таксама былі арганізаваныя паездкі на «Славянскі базар» у Віцебск, у сталічныя тэатры, у філармонію, ездзілі на Дзень пісьменства ў Іванава. Валянціна Мікалаеўна кажа, што яна настройвае кіраўнікоў пярвічных арганізацый на такую работу, каб цягам года кожная жанчына была нейкім чынам адзначаная: калі не ўшанаванне на свяце, то паход у музей ці на канцэрт альбо падарунак за ўдзел у канкрэтнай акцыі.

Скажам, вызначыліся жанчыны ў гарадской акцыі «Вышыванка», праявілі актыўнасць, творчасць, зацікаўленасць — найлепшым з іх уручылі падарункі.

— Уся работа арганізацыі накіраваная на павышэнне статусу жанчыны, яе значэнне ў грамадстве, — адзначае Валянціна Кулак. — Як ужо было сказана, мы працуем у Саветах і актыўна ўдзельнічаем у выбарах. Мы прапаноўваем свае кандыдатуры, калі складаюцца спісы рэзерву кадраў, выступаем ініцыятарамі новых праектаў і пачынанняў. Мы многа робім для самарэалізацыі і павышэння інтэлектуальна-культурнага ўзроўню саміх жанчын. Напрыклад, сёлета далучыліся да аднаго з праектаў Палескага ўніверсітэта па вырошчванні экалагічна чыстай прадукцыі. Спачатку нашы жанчыны навучацца вырошчваць такую прадукцыю для сябе, а потым не выключаецца магчымасць для некага адкрыць нават невялікі бізнес. Мы актыўныя ў сваёй арганізацыі і пастаянна заяўляем пра сябе ў горадзе.

УНП 201027527.




**Старшыня гарадской арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын» Валянціна КУЛАК расказвае аб праведзеных акцыях. Фотаздымкі зробленыя ў час суботніка ў горадзе і наведвання актывістамі дзіцячых устаноў падчас акцыі «Збяром партфель разам».**